Н. Ф. Гікало

# Ён будзіў і клікаў

Жыва памятаю бліскучыя выступленні Кірава на народным з'ездзе Терскай абласці ў Маздоку ў 1918 г. Гэтыя выступленні будзілі, клікалі на барацьбу працоўных горцаў, казакаў, рабочых. Адзін сівы, стары горац, памаладзеўшы пасля прамовы Сергея Міронавіча, лёгкім поступам горца ўзабраўся на трыбуну з'езда і ў сваёй адрывістай гартаннай прамове кляўся ў адданасці справе рабочага класа, совецкай улады.

Незабыўны вобразы страснай і магутнай прамовы Кірава на заключным пасяджэнні, калі ён заклікаў дэлегатаў з'езда да апошняй кроплі крыві змагацца за свабоду. Ён прывёў прыгожую старажытную легенду аб Праметэю, як увасабленні свабоды, прыкаваным да скалы на вяршыні Казбека, чыё змардаванае цела нястомна дзяўбе арол. І маладыя, і старыя, і горцы, і казакі, і рабочыя ўскаквалі з месц і ў нястрымнай страсці да перамогі над векавой цемнатою крычалі на розных мовах сваё прывітанне большэвікам, Леніну і скромнаму прамоўцу, які клікаў іх на барацьбу за вызваленне чалавецтва.

З'езд галасаваў у сваёй пераважнай большасці за прапанову большэвікоў і паслаў тэлеграму Совету Народных Камісараў—Леніну, вітаючую Окцябрскую рэволюцыю і ўладу Советаў. І цяпер ужо не дзесяткі, а сотні агітатараў раз'ехаліся па аулах змагацца за справу, пачатую Леніным. Гэтыя агітатары праніклі глыбока ў станіцы, аулы, лясы і горы і ўсюды збіралі дэлегатаў на з'езд у Пяцігорск.

Пазней прыходзілася сустракацца і бачыць тав. Кірава ўжо ў іншай абстаноўцы. Войскі інтэрвентаў, банды айчынных генералаў, памешчыкаў і капіталістаў разгромлены і раздаўлены рабочымі і сялянамі совецкай краіны. Трэба было ўмацоўваць совецкую ўладу, аднаўляць прамысловасць і сельскую гаспадарку. К канцу 1920 года я сустрэў Кірава ўжо як члена Каўказскага бюро ЦК ВКП(б).

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы